# У падтрымку чытання



*Фота Віктара Іванчыкава.*

Бібліяноч — падзея, якая стала традыцыйнай для ўсіх, хто любіць чытаць. З нагоды Дня кнігі штогод бібліятэкі нашай краіны пашыраюць фармат сваёй работы і чакаюць наведвальнікаў у нязвыклы час. Сёлета кніжніцы ўсіх рэгіёнаў Беларусі запрашалі прыняць удзел у маштабнай акцыі «Бібліяноч-2024». Мноства тэматычных пляцовак на любы густ і ўзрост, лекцыі, майстар-класы, экскурсіі, творчыя сустрэчы, гульні для дзяцей і дарослых — далёка не ўсё, што чакала гасцей.

Галоўнай жа пляцоўкай падзеі стала Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Пасля ўрачыстага старту акцыі ў цэнтральным холе галоўнай кніжніцы краіны кожны змог выбраць занятак, які адпавядае яго зацікаўленням. Нехта спарабаваў свае сілы ў актыўных квэстах, пазнавальных квізах, шахматна-шашачных турнірах і настольных гульнях. Тыя, хто вырашыў даведацца нешта новае, пайшлі слухаць лекцыі адваката, псіхолага, астролага і стыліста, наведалі майстар-класы па тэхніцы кітайскага жывапісу і графікі, танцах, ігры на нязвыклых для нас музычных інструментах. А для маленькіх аматараў кнігі разгарнулася пляцоўка «Дзеткі + Продкі» са мноствам цікавых забаў.